Cana asobnaha numaru 20 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam.

Nr. 6 (551). Wilnia, Niadziela 4 Lutaha 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adres Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 ran. da 4 hadz. wieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Biel. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

З нагоды зьмены Конституцыі.

Констытуцыяй завуцца аснаўныя законы дзяржавы. У Польшчы фармальна абавязваючай да апошняга часу была Констытуцыя, прынятая Уставадаўчым Соймам у 1921 г. Гэтая Констытуцыя адзначалася тым, што яна ўсю ўладу над Польшчай давала Сойму, а бадай ніякую ўраду і Прэзыдэнту. Так зрабілі эндэкі, якія тады непадзельна кіравалі Польшчай, каб ня даць улады марш. Яз. Пілсудзкаму, які тады быў начальнікам Польшчы і мог быць выбраным на Прэзыдэнта.

Ад году 1926, калі марш. Пілсудзкі зрабіў пераварот, Констытуцыя паволі атрымала для Прэзыдэнта ад Сойму шырэйшую ўладу, як права разьвязваць Сойм і Сэнат і — з некаторымі аграніченьнямі — права самастойна выдаваць законы.

Але староннікам марш. Яз. Пілсудзкага, якія ад траўня 1926 г. маюць дэцыдуючае значэньне ў палітыцы Польшчы, гэтага было мала і яны ўсьцяж імкнуліся да стварэньня новай, адпавядаючай іх палітычным паглядам, Констытуцыі. З гэтымі думкамі яны праводзілі выбары ў Сойм і Сэнат, стараліся, каб пасолоў і сэнатараў, староннікаў маршалка, была пераважаючая большасьць і ўрэшце добрыя тры гады працавалі над новай Констытуцыяй.

Урэшце настаў шчасьлівы для цяперашняга ўраду дзень 26 студзеня сёл. г., калі староннікі яго ў Сойме правялі імі-ж апрацаваную і даўно жаданую, новую Констытуцыю.

Як 26 I была ў Сойме праведзена новая Констытуцыя, аб гэтым польскія опозыцыйныя да ўраду газэты пішуць шмат цікавага Некаторыя з іх („Dz. Wil." 29.I) дасьціпна кажуць, што новая Констытуцыя прайшла пудам, якія дзеяліся і пры выбарных урнах.

Але нас гэта мала абходзіць, запытаймо лепш, у чым-жа сутнасьць новай Констытуцыі, якая, прайшоўшы неўзабаве праз Сэнат, станецца абавязваючай? Восьжа сутнасьць гэтай «цудоўнай», як самі палякі яе завуць, Констытуцыі ў тым, што яна бадай касуе парлямэнтарызм, бо блізу ўсю ўладу забірае ад Сойму і перадае яе Прэзыдэнту. Некаторыя польскія («Przegląd Katolicki» 24.XII.33) газэты, разважаючы тэзы праекту новай Констытуцыі, даслоўна выражаюцца, што яна прэзыдэнту дае большыя правы ад тых, якія маюць у некаторых краёх адказныя прад Констытуцыяй каралі.

Новая Констытуцыя дужа зручна датасавана да пануючых сяньня ў Польшчы палітычных адносінаў. Так у ёй усё скроена, што ані выбары прэзыдэнта, ані Сэнату, ані нават Сойму—хоць выбары яго маюць адбывацца пастарому —ня могуць не правесьці тых людзей, якія зьяўляюцца староннікамі сяньнешняга палітычнага ў Польшчы рэжыму.

Але не забываймо, што ніякі палітычны рэжым ня трывае вечна — ён зьмяняецца, зьмяняюцца настроі, даходзяць да ўлады людзі новых палітычных кірункаў. Мусіць гэта наступіць некалі і ў Польшчы і тады ўзноў нанова пачнецца калатня за Констытуцыю. Ды й бяз гэтага — на прэзыдэнскім крэсьле можа засесьці чалавек, не канечна годны, а маючы гэткую шырокую, бадай нічым неграгранічаную, уладу, можа нарабіць шмат «цікавага». Сусім-жа іншая рэч, калі паўната ўлады знаходзіцца ў руках прадстаўнікоў усіх грамадзян дзяржавы, у руках Сойму.

Ясная рэч, што новая Констытуцыя затым такая, што ў Польшчы больш чым траціна насельніцтва — гэта не палякі. Праўда, у новай Констытуцыі ёсьць некалькі прыгожых слоў, што і да не палякоў можна іх тасаваць і цэлыя нават параграфы гэткіх слоў устаўлены ў яе са старой Констытуцыі, але мы добра ведаем значэньне ўсякай Констытуцыі на паперы і на дзеле. І вось, ня гледзячы на тое, якой-бы ня была сама Констытуцыя, у гэна «констытуцыйнае дзела» ў Польшчы ў нас беларусаў, на жаль, няма— ніякае веры.

Але наша надзея ня ў гэтым, а ў беларускім дзесяцімільёным народзе, які абудзіўшыся да жыцьця, вобак з суседнімі падобнымі сабе народамі, мазалём сваім будзе кавацъ сваю долю і волю аж да поўнай сваей самабытнасьці. Не дарма-ж кажуць, што народы ня ўміраюць.

Новы коопэратыўны закон.

Праект новага коопэратыўнага закону ўжо зложаны ў Сойме. Праект агранічывае свабоду коопэратыўнага руху, бо паддае яго сільнай кантролі і апецы дзяржаўных уладаў.

Ciažki los biełaruskaj mowy.

Horšaha niama prastupku i niama brydčejšaj sprawy, jak łamańnie naturalnych prawoŭ čaławieka. Jašče, kali heta rabiłasia niekali tam daŭna, daŭna ŭ historyi čaławiectwa, dyk hena darawać možna, bo nia było kultury i cywilizacyi i ludzi byli dzikimi, ale kali heta samaje robicca siahońnia na tak wysoka kulturnym i cywilizawanym świecie, dyk minać hetaha moŭčki nielha.

Naturalnaje prawa dla biełarusa — miž inšym — heta karystańnie jahonaj rodnaj mowaj, jakaja siahońnia ŭ nas łomicca, topčycca i bywaje pahardžanaj. Ja pytajusia ludziej, čamu heta nam biełarusam siahońnia zabaraniajecca hawaryć pabiełarusku? Ciž heta nia jość łamańnie naturalnych prawoŭ biełarusa?

Uziaŭšy na zdarowy rozum, dyk chto heta i kamu i kali zabaronie hutaryć tak, jak jon choča? Na't ab hetym u nas złažyłasia bojkaja pahaworka: „Jazyka čaławieku nie zawiažaš". Ale woś siahońnia takija časy nastali i znajšlisia takija ludzi, što ŭsiožtaki jazyki adzin druhomu jany wiažuć. A heta najbolš zwalwajecca na nas biełarusaŭ. Nia ŭ tym sensie, kab my sami sabie jazyki wiazali, ale ŭ tym, što našy worahi, błahija ludzi, rodnuju mowu nam adbirajuć. Sapraŭdy worahi našyja nam jazyki zawiazywajuć. Jany kidajucca na rožnyja sposaby, kab tolki my nie hawaryli pabiełarusku. Nawat rasiejski car u hetaj sprawie i to nia wiedaŭ takich štukaŭ, jakimi ludzi siahońnia karystajuć. Car pisaŭ tolki na doščačkach, što woś tut, abo tam zabaraniajecca hawaryć papolsku, ale ŭ praktycy, dyk ludzi hawaryli, jak chto chacieŭ. My biełarusy henyja carskija doščački čytali, ale tady nie razumieli dobra henaj zabarony, bo jana nas biełarusaŭ nie začapała. My sabie dumali tady: „Ale-ž i ździekujucca rasiejcy nad palakami, na't hawaryć im nie pazwalajuć!" Biełarusy padobnych doščačkaŭ ad rasiejcaŭ tady nia mieli i jazyk naš zatoje chadziŭ kudy swabadniej, čym heta jon robić siahońnia. Praŭda, nam na doščačkach siahońnia nichto nia piša, što zabaraniajecca nam hawaryć pabiełarusku, ale druhimi sposabami, jašče wastrej, jak z doščačkami, i nam usiožtaki zabaraniajecca hawaryć pa. biełarusku. Prykładaŭ ab hetym žyćcio nam sule wielmi mnoha. Peŭnaž, tut paminajucca biełaruskija sialanie, što papolsku ani słowa nia ŭmiejuć. Im tolki adnym pakidajecca swaboda, bo ich nichto nie baicca. Ale inačaj robicca z druhimi biełarusami, katorych našyja worahi bajacca.

Woźmiem choć-by biełaruskich ksiandzoŭ. Wy ich ludzi ciapier i nia pytajciesia, čamu jany, — z małymi wyniatkami, — nie haworać pabiełarusku kazańniaŭ. Im-ža nia možna pabiełarusku ani pary z zuboŭ wypuścić. Šmat u hetym jość walniejšym duchawienstwa prawasłaŭnaje, ale jano, wiedajučy, što biełaruskaja mowa nie padabajecca načalstwu, hetaj mowy takža staranicca. U druhim wypadku hlaniem my na biełaruskaha świeckaha intelihienta. Jon taksama źwiazany kruhom, kab tolki ani słoŭca nie hawaryć pabiełarusku. A biełaruskija dzietki ŭ polskaj škole — jany-ž taksama nie hawarać pabiełarusku.

Urešcie treba i da taho pryznacca, što ahułam biełaruskim šyrokim masam hawaryć pabiełarusku adradžajuć. Bo na ich to ksiondz za heta kryčyć, to baciuška paśmiajecca, to za heta krywicca načalnik pošty; a kali, dy palicyjant prypadkam, ci biez prypadku dawiedajecca, što niejki biełarus lubić swajo rodnaje słowa, dyk tady sielanin naš až dryžyć sa strachu, biada! Woś my i bačym, jak i kamu naša rodnaja mowa pazwalajecca, a jak i kamu jana zabaraniajecca. My ciapier jasna bačym, chto jeju hawora, a chto nie hawora i dziela čaho nie hawora. Prydzie adnak čas, a jon užo blizka, kali biełarusy wyjhrajuć wialikuju wajnu za swaju rodnuju mowu!

Wuša.

З дзейнасьці Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

в. **Крыніца**, Маладэчанскага пав. З справаздачы, якую прыслаў у Цэнтралю Інстытуту Гурток у в. Крыніцы, відаць, што гурток ня мог разьвіць шырэйшай дзейнасьці дзеля нястачы моладзі з вышэйшай або сярэдняй адукацыяй, а такжа дзеля нястачы матэрыяльных спосабаў і галіты вёскі. Дзейнасьць гуртка выключна агранічылася да чытаньня і пашыраньня кніжак і газэт: „Беларускай Крыніцы" і „Шляху Моладзі".

(Вялікая шкада, што ўрад гуртка не прыслаў вестак аб колькасьці кніжак, якія ёсьць у бібліятэчцы гуртка і колькасьці газэт, якія разыходзяцца ў ваколіцы пры пасярэдніцтве гуртка).

Апроч гэтага гурток просіць прысылкі кніжкі, як „Гісторыя Беларускай (Крыўскай) Кнігі" Ластоўскага, гадавікоў газэт і інш.

в. **Расла**, Вялейскага павету. Дня 21.I.34. адбылося агульнае сабраньне Раслаўскага гуртка Б.І.Г. і К. з такім парадкам дня: 1) справаздача старога ўраду, 2) выбары новага ўраду, 3) бягучыя справы.

У новы ўрад на 1934 год выбраны такія асобы: старшыня — Міхал Ярмак з Сакальца, скарбнік — Ян Рыдзель з Расла, сэкратар— Ян Блажка з Расла; у заступнікі сяброў ураду: Міхал Шэвэрэнка і Пётра Ведзень; у рэвізыйную камісію: Марыя Пішчака і Ізыдар Шусьціцкі; загадчык бібліятэкі Ян Блажка; адказны за бібліятэку Ізыдар Шусьціцкі.

Дзейнасьць гуртка ў 1933 г. была наступная: 15.VIII. была прачытана лекцыя на тэму „Спажывец і коопэрацыя", лектар К. Чартовіч; адбыліся 2 паседжаньні ўраду гуртка; спэктакляў-вечарын ня было дзеля зьбядненьня вёскі і дзеля вялікай аплаты за дазвол; ня ўсе сябры ўнясьлі сяброўскую складку, так, што адчуваецца недахват грашэй у касе гуртка; апроч гэтага гурток пашыраў у вялікай колькасьці беларускае друкаванае слова, асабліва газэты. (Вялікая шкода, што ўрад гуртка не падаў стану сваей бібліятэчкі.)

ГРАМАДЗЯНЕ! Усе на ніву культуры! Гдзе няма, — арганізуйце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры а гдзе ўжо заложаныя — узмоцніце ў іх працу!

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Таварыскі вечар. У мінулую суботу 28 студня Віленскі Аддзел Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ладзіў таварыскі вечар Вечар у грамадзе 100 асоб адбыўся ў памешканьні Інстытуту (Завальная 1—1) вельмі сымпатычна; беларускі хор пад кіраўніцтвам А. Стэповіча прапяяў некалька народных песьняў, так-жа пяяліся бел. нар. песьні і цэлай грамадой, адбыліся дэклямацыі і таварыскія гутаркі пры скромных блінох з вярашчакай ды шклянцы гарбаты. Пры гэтым моладзь у прысутнасьці старэйшых мела магчымасьць і танцаваць.

Пасольская прамова. Падчас абгаварваньня праекту конституцыі ў Сойме пасол Ярэміч выступіў з прамовай, у якой, выявіўшы фактычнае праўнае палажэньне беларускага народу, заявіў, што будзе супроцьставіцца зьмене конституцыі.

5-тыя ўгодкі выдавецтва „Шляху Моладзі“. 16-га лютага с. г. мінае 5 гадоў ад заснаваньня ў Вільні Рэдакцыйнае Калегіі „Шляху Моладзі“ і яго выдавецтва. Дзеля належнага адзначэньня гэтага юбілею Рэдакцыйная Калегія пастанавіла выдаць за месяц люты с. г. павольшаны нумар „Шляху Моладзі“ і наладзіць адпаведны вечар дня 25 лютага с. г. у залі Бел. Інстытуту Г. і К. (Вільня, Завальная 1—1), у праграму якога ўвойдуць: справаздаўчы рэфэрат з выдавецкае дзейнасьці Рэдакцыйнае Калегіі „Шляху Моладзі“ за 5 гадоў і канцэртны аддзел.

З выдавецкае нівы. Гэтымі днямі выйшлі: „Самапомач“ — беларуская коопэратыўна-гаспадарчая часопісь на м-ц студзень 1934 г. і „Шлях Моладзі“ — часопісь на м-ц студзень 1934 г.

„Беларусь Працы“. Пад гэткім назовам гэтымі днямі паказалася на сьвет у Вільні новая беларуская газэта, друкаваная гражданкай. Характар яе нацыяналістычны, а палітычны кірунак — угадова-польскі. Цікавае вось тут зьявішча, што „нашы“ ўгадоўцы, падыйсьці да народу змушаны ўжо апранацца ў беларускі нацыяналізм.

Sialanie ŭ Niezaležnaj Litwie. [1]

(*„Viln. Rytojus“ Nr. 6, 1934*).

Litoŭskaja hazeta „Vilniaus Rytojus“ (Nr.Nr. 6 i 7 siol. h.) u staćci pad zahałoŭkam „Uražańni z padarožy ŭ Koŭnu“ padaje mnoha cikawych wiestak ab žyćci litoŭskich sialan u ich rodnaj niezaležnaj dziaržawie. Uważajem karysnym paznajomić z žyćciom henym našych sialan biełarusaŭ.

Woś-ža na pačatku ŭspomnienaj staćci pradusim słušna padčorkwajecca, što hałoŭnaj aporaj Litwy ŭ najciažejšych chwilinach jaje historyi zaŭsiody byŭ sialanski narod i što dziela hetaha adradžanaja Litwa na sialanskaj asnowie pačała stawić uwieś budynak niezaležnaści, asabliwuju zwaročwajučy ŭwahu na dabrabyt sialanstwa, ab jakim u staćci henaj dalej spatykajem nastupnaje:

...„Litoŭskaje sialanstwa, budučy silnym narodnym ducham, było słaboje materjalna. Byli heta małaziamielnyja i biezziamielnyja žychary wioski. Da taho-ž u mnohich miajscoch ich haspadarki padčas wajny byli źniščany i duža zapuščany. Treba było henym małaziamielnikam i biezziamielnikam dać stolki ziamli, kab jany z swajej siamjoj mahli pražyć i kab mahli wyrabić jak najbolš sialanskich tawaraŭ na prodaž. Dziela hetaha treba było sialanskija haspadarki prytasawać da nowych žyćciowych warunkaŭ i patreb, treba było pawialičyć ich praduktyŭnaść i ŭradžajnaść...

Zadańnie heta duža ciažkoje, adnak urad niezaležnaj Litwy spoŭniŭ jaho zručna i chutka.

Jašče ŭ 1919 h. litoŭski ŭrad apracawaŭ plan i pačaŭ prawodzić ziamielnuju reformu, jakaja mieła za hałoŭnuju metu nadzialić ziamloj biezziamielnych i małaziamielnych. Dziela hetaha byli pazabirany i padzieleny ziemli dwornyja.

Dwaroŭ u Niez. Litwie było šmat. Da ich należyła 720,000 hektaraŭ ziamli. Ich ułaśniki badaj usie byli nielitoŭcy i worahi litoŭskaj niezaležnaści. Z hetaj pryčyny litoŭski ŭrad usie dwornyja ziemli ŭziaŭ pad swaju apieku i padzialiŭ ich miž biezziamielnymi i małaziamielnymi, a asabliwa miž tymi, što byli dabrawolcami i wajawali za niezaležnaść Litwy. Usim im urad daŭ nia tolki ziamlu, ale drewa na budynki i hrošy na nasieńnie i na inwentar.

Druhoj metaj ziamielnaj reformy ŭ Litwie było raźbić usie sioły na chutary, bo tam, jak i ŭ Wilenščynie, badaj usie sialanie žywuć pa siołach, dzie, jak wiedama, susim niemahčyma padniać ziamielnuju kulturu. Sialanskaj niepadzielenaj na chutary ziamli spačatku było 1,632,000 hektaraŭ.

Za rassialeńnie wiosak uzialisia z usiej siły. Praca heta pajšła dawoli chutka. Sialanie achwotna zhadzilisia iści na chutary, bo ŭrad rassialaŭ ich darma i dawaŭ padmohu: hrašmi, drewam, nasieńniem, rasowaj žywiołaj i inš. Pastanoŭlena, što ŭ 1935 h. usie wioski Niezaležnaj Litwy buduć rassieleny na paasobnyja haspadarki, što ŭ Polščy maje być zakončanym pa sotni hadoŭ“.

Z litoŭskaj mowy pierakłaŭ **M. K.**

Polska - niamiecki mir
na 10 hadoŭ.

Dnia 26 studzienia s. h. u niamieckim ministerstwie zahraničnych spraŭ pradstaŭniki Niamieččyny i Polščy padpisali dahawor ab nienapadańni. U hetym dahawory skazana: polski i niamiecki ŭrady ŭważajuć, što nastupiŭ mament kab raspačać nowy etap u polska-niamieckich palityčnych adnosinach šlacham biespasredniaha parazumieńnia adnoj dziaržawy z druhoj. Abodwa ŭrady zajaŭlajuć, što namierany wyrašać usie sprawy datyčačyja abiedźwioch staron biespasredna apirajučysia na asnowach paryskaha dahaworu z 27 žniŭnia 1928 h. Dziela hetaha nikoli nia buduć tasawać zbrojnaj siły dziela wyrašeńnia spornaj sprawy.

Hety dahawor, jak i ŭsie mižnarodnyja dahawory, musić być ratyfikawany, bo tolki tady jon budzie prawamocnym aktam. Ale pry siańniašnich palityčnych abstawinach, jak u Polščy tak i ŭ Niamieččynie, hałasy suproć hetaha dahaworu buduć nia značnyja i dahawor budzie ratyfikawany z abiedźwioch staron.

Zaklučeńnie miž Polščaj i Niamieččynaj hetaha dahaworu biazumoŭna maje wialikaje značeńnie i ŭ palitycy mižnarodnaj, dyk i ničoha dziŭnaha, što hetym dahaworam zacikawilisia inšyja dziaržawy, a ŭ asobnaści SSRR. Razumiejecca, što hety dahawor nie likwiduje sporaŭ miž hetymi dziaržawami, jakija wypływajuć z ich susiedztwa, ale hetyja spory majuć wyrašacca parazumieńniem abudwych krajoŭ biez nasilla i aružž . A heta ŭ wa mnohim raźwiazwaje ruki dziejnaści abiedźwiom dziaržawam. Pry hetym treba zaznačyć, što hetu hwarancyju hety-ž dahawor stabilizuje na 10 hadoŭ.

Namieśnik Maskwy ŭ Miensku ab biełaruskich wučonych.

Namieśnik Maskwy ŭ Miensku, prezydent Bieł. Akademii Nawuk P. Horyn, apublikawaŭ u „Izwiestijach“ staćciu. Miž inšym piša ŭ joj hetak—„U Biełaruskaj Akademii Nawuk zasiadali ŭ swoj čas lepšyja nacyjanał-demokratyčnyja kadry: Ihnatoŭski, Losik, Niekraševič, reprezentujučy kontrewalucyjnuju padryŭnuju rabotu prociŭ dyktatury proletarjatu. U apošnija hady ŭ akademii staralisia akapacca pryšoŭšy na źmienu Ihnatoŭskamu i Niekraševiču nowyja pawadyry biełaruskaha nacyjanał-demakratyzmu: Miatła, Bursewič i druhija zdradniki pracoŭnych masaŭ...“

Woś apinija namieśnika Maskwy ŭ Biełaruskaj Akademii Nawuk u Miensku ab zastrelenym praf. Ihnatoŭskim i wysielenych z Biełarusi razam z Niekraševičam i Losikam bieł. kulturnikach. Apryčnik Maskwy Horyn zraŭniaŭ z biełaruskimi wučonymi i swaich wiernych słuhaŭ, jakija tut u Zach. Biełarusi wykonwajučy zahady Maskoŭskaha kominternu nia zusim zasłužyli na łasku Maskwy i ciapier za „prahrašeńni“ ačyščajucca ŭ lochach G. P. U.

Эпархіяльны зьезд.

Падобна, як у мінулыя гады, сёлета таксама адбыўся ў Вільні чарговы эпархіяльны зьезд, які трываў ад 23 да 25 студня ўключна. Розьніўся ён крыху ад папярэдніх тым, што называўся зьездам духавенства і міран, хоць „міран“ было ўсяго толькі некалька, дый тыя ня выбранцы народу,—дык і „пяялі“ на зьезьдзе тое, што было прыказана. Старшынёй зьезду быў з багаслаўленьня арх. Хвядоса (не з выбару духавенства) прат. Дзічкоўскі.

Пастановаў у справе беларусізацыі царкоўнага жыцьця ня было. Відаць пастыры маскоўцы ніяк ня могуць пагадзіцца, што няма ўжо цара-батюшкі.

Пры гэтым трэба адзначыць, што на гэным зьездзе нэгатыўнае становішча сьвяшчэннікаў да беларусізацыі царквы падтрымаў сваім жаданьнем беларусізацыі Р. Астроўскі, бо трудна Царкве споўніць жаданьні тых асоб, якія з Царквой ня маюць нічога супольнага, як Р. Астроўскі. Ягонае выступленьне на прав. зьездзе—гэта сапраўды правакацыя справы беларусізацыі Царквы

Бальшавіцкі падкідыш
або
„Літэратурная Старонка“.

25 студня с. г. выйшаў у Вільні першы нумар часопісі „Літэратурная Старонка“ — месячнік літэратуры, мастацтва і крытыкі. Выдае нейкі Янка Патаповіч, ён-жа адказны рэдактар.

Пачынаецца часопісь д е к л я р а ц ы я й (выразна праз д е. .) групы паэтаў да ўсіх пісьменьнікаў Заходняе Беларусі. Пад дэкляарацыяй подпісы: Янка Чабор, Міхась Васілёк, А. Рэдзька, Пятрусь Граніт, Зьвястун, Анатоль Івэрс.

Дзіўна, як трапіў у гэтыя заганяйлы на беларускі пролет-Парнас Міхась Васілёк, якога савецкая прэса ў БССР даўно аднясла да ліку нацдэмаўцаў, шкоднікаў і г. д.

З дэкляарацыі відаць, што гэтая „Літстаронка“ — чысьцейшы бальшавіцкі падкідыш: сплоджаны няраз у моцным стагнаньні недавараннага натхненьня, неахайны ў сэнсе правапісу падкінены ён з мэтаю гадаваць у народнай душы. . гнеў-пратэст, социяльную злосьць, ненавісьць ды помсту, як гэта выразна пішацца ў дэкляарацыі і ў „творах“ збальшавізаваных дзяцюкоў

Гымн... Кастрычніку, радасьць з прычыны агню, крыві, бураў, вайны, выгнаўшай мільёны нашых сялян на Каўказ, у Ташкент, Сыбір, Маскву, на Урал etc., затручаная сьліна на ўсё, што небальшавіцкае ў беларусаў, вынаход няіснуючай беларускай буржуазіі з яе нібыта песьнярамі, як Бартуль, Арсенева, Казлоўшчык, Ільяшэвіч, Вількоўшчык — вось што такое гэтая дэкляарацыя.

Зацытуем хоць-бы гэткую „красачку“ з размашыстага, аж на 4-х бачынах зьмешчанага сов-букету-дэкляарацыі.

...„Кастрычнік. Заліта краіна народам. Народ сьмяецца перамогай. Разам, як і на заводзе, чыгунцы, так і тут у калёнах, у шэрагах замасьляных курткаў, з худымі тварамі, поўнымі сьмеху вачыма, разам з рускім, мангольцам, паляком, латышом, украінцам, сартам, башкірам, чувашом, — заўсёды думны, узросшы на песьнях пакуты, сёньня бадзёра ішоў беларус з стрэльбаю, бомбаю і кулямётам, каб радасьць і гнеў узмацаваць нязломнаю сілай...“

Чытаеце і здаецца вам, што жывеце ўсё яшчэ ў сталінскай імпэрыі, з народамі якое гэтак моцна вяжуць беларуса аўторы «Літстаронкі», што называюць добрых 5 процантаў народнасьцяў б. Расеі А чаму-ж не называць іх усіх, нашто было прапушчаць гэткіх, як: асьцякі, самаеды, чукчы, юкагіры, айносы, камчадалы і інш.?

Што датычыць мастацтва, дык яго ў „Літстаронцы“, як кот наплакаў: усяго толькі адна невялічкая віньетка.

Літэратура — пераважна вершы. Паход пачынае Янка Чабор „вершам“ — „Заклік“, гэткае—з пазваленьня сказаць — высокае „мастацкае“ работы:

„Сябры!
Мы бяромся за работу
Не нажарты
Час даўным, даўно было ўзяцца,
Бо адсталі
Далёка ўзаду ад другіх.
Я іду — клічу ўсіх
Шагаць горда ў вядомыя далі.
Гэй, вышэй галаву!
Вышэй сьцяг барацьбы
За справу сялян і рабочых!“

Хопіць гэтых словаў „верша“ дзеля пазнаньня, што за талент мае гэты Чабор. З гэткімі здольнасьцямі нявартa марнавацца ў Заходняй Беларусі, лепш проста лезьці ў „рай“, папрабаваць кар'еры нацдэма, шкодніка, пабыць на Салоўках...

Рэдакцыя сваім артыкулам хваліць Патаповіча, што ён сам перамог матэр'яльныя труднасьці на першы н о м е р (так і напісана — номер), ды прызнаецца, што радзілася „Літстаронка“ ад „Белгазэты“. Ня дзіва! Якая-ж іншая маці патрапіла-б пусьціць на сьвет бальшавіцкага падкідыша?

Можна было і ня пісаць аб радаслоўнай, бо даўно ўжо вядома, што Сьмердзякоў радзіўся ад Тодара Карамазава і Лізаветы Сьмярдзючай.

З публіцыстычнага зусім артыкулу нейкага М. Руніча даведваемся, што яму вельмі не падабаецца нават і незайздроснае, здаецца, існаваньне, як ТБШ, так і Інстытуту Гасп. і Культуры, як „Новага Шляху“, так сама і „Золака“ ды „Бел. Крыніцы“, як Стэповіча, так і Клімовіча, Марцінчыка, Стэцкевіча ды Шырмы.

Бядуе, відаць, гэты Руніч, што нельга іх яшчэ ўсіх упакаваць да лёхаў ГПУ проста тут, у Вільні.

32 бачыны журнальнага фармату, поўныя бяздарных, за малым выняткам, вершаў. На фоне шэрай бальшавізанскай тарабаршчыны, выдзяляюцца хоць вытрыманасьцю разьмеру вершы Фр. Грышкевіча, Васілька і Зьвястуна, які сваім вершам „Моладзі“ падрабляецца пад тон марсэльезы Дзям'яна Беднага: „Мы пожара всемірнаго „пламя“. Хіба што ўсе гэтыя „вершатворцы“ падпісваюцца псэўдонімамі і крыптонімамі: А. Л—скі, Граніт, Ю. Б—а, У—р Шчыры, К—с, У. Т.

Канчаецца часопісь маленькаю хронікай, толькі не літэратурнаю, а палітычнаю.

І каштуе для набыўца ўся трасянка н о м е р у аж 50 грош.

Усюды на культурным сьвеце, каб быць літэратарам, — патрэбен талент, толькі ў бальшавікоў гэта неабавязкава, абы вытрымана была чародная партыйная лінія.

Што-ж? Радзім ім і хадзіць пачаць дагары нагамі. А верым, што атруціць беларускую душу ім ня ўдасца нават і тады, калі атрута падносіцца імі будзе да вуснаў нашага народу пад сосам літэратуры ці мастацтва.

Просты душою заходня-беларускі селянін і добры па натуры, але няраз ён ужо правучаны бальшавікамі, і гадаваць іхнага падкідыша ў сваёй беднай хаце ня будзе.

Эм.

Hoład u Wilenščynie.

Letašni nieūradžaj ū niekatorych pawietach Wilenskaha wajawodztwa ūžo spryčyniū hoład. Najbolš hrozna ū Dzisienskim pawiecie. Tam užo kala 2000 asob apynułasia ū krajnie ciažkim pałažeńni Šyroka wa ūsiej Wilenščynie zdarajucca nia redka wypadki epidemii chwarob ad hoładu.

Wajawodzkija dziaržaūnyja ūłady zahadali paduładnym sanitarnym arhanizacyjam ścisła śladzić za hetaj prajawaj, a tak-ža zahadana padkarmliwać haładajučych ludziej, u pieršuju čarhu dziaciej.

Na naš pahlad, adny zachady administracyjnaj ułady ad hoładu ū hetych pawietach nie ūratujuć. Tut patrebna šyrejšaja akcyja i realnaja pomač. Hetaj sprawaj pawinny zaniacca i hramadzkija arhanizacyi, a tak-ža prawasłaūnaje i katalickaje duchawienstwa.

Prad źjezdam i na 17 źjeździe Kompartyi S. S. S. R.

Z nahody 17 źjezdu Kompartyi SSRR., jaki ciapier adbywajecca ū Maskwie, prad samym źjezdam roznyja piśmieńniki ū Sawietach wykazali swaje „wiernapaddanskija“ pačućci balšawikom nahawaryūšy kamplimentaū u pakłonach Stalinu, što „излияние чувст“ praktykawanaje pry carocн u Rasieji prad ciapierašnim niachaj chawajecca. Razumiejecca, tam iłhuć „вовсеуслышание“ i nichto piarečyć nia śmieje. „Niama takoha kraju wa ūsim świecie, dzie jak u nas piśmiennik moh by z poūnaj i ūsio abymajučaj ščyraściaj hawaryć praūdu.“

Na źjeździe Stalin skazaū wialikuju palityčnuju pramowu ab zahraničnaj palitycy, miž inšym kažučy he tak: Wajna Japonii suproć Kitaju i akupacyja Mandžuryi pahoršyli pałažeńnie na Dalokim Uschodzie. Pieramoha fašyzmu ū Niamieččynie zawastryła adnosiny ū Eūropie. Wystupleńnie Niamieččyny i Japonii z Lihi Narodaū zradziła nowy impuls azbrajeńnia i padhataūleńnia da wajny. Sawiety adasobnienyja zmahajucca z hetym chaosam Haworačy ab haspadarčym kryzysie, Stalin ścwiardžaje, što kryzys užo prachodzić, adnak nia dojdzie da paprawy ekanamičnaj sytuacyi. Stalin tak-ža ścwiardžaje. što ū apošnija časy adnosiny miž Sawietami, Polščaj i Francyjaj dobra naładzilisia. Pry hetym zapeūniaje Stalin, što ab źmienie adnosinaū Sawietaū da Wersalskaha traktatu i hutarki niama. Ahułam kažučy, Stalin pramaūlaū wielmi aściarožna i nawat ab adnosinach Sawietaū z Japonijaj wyraziū nadzieju paprawy, dziela čaho Sawiety i dalej buduć wiaści mirnuju palityku ū adnosinach da Japonii.

Słowam, z pramowy Stalina wyhladaje, što balšawiki starajucca tolki ūtrymacca ū siabie doma i ūžo zabywajucca ab suświetnaj rewalucyi.

Palityčnyja zawarušeńni ū Francyi.

Afera Stawiskaha, ab jakoj my ūžo padawali, u Francyi silna ūzburyła hramadzianstwa. U Paryžy adbywajucca masawyja demanstracyi manarchistyčnaj moładzi, zarhanizawanaj „Francuskaj Akcyjaj,“ jakaja wystupaje prociū uradu i parlamantu z pryčyny tušawańnia afery Stawiskaha. Suproć demonstrantaū wystupiła palicyja. Na wulicach Paryža pačalisia bai. Hetu nahodu wykarystali kamunisty i pačali swaju rabotu. Na wulicach paūstali barykady manarchistaū i kamunistaū. Aryštawana kala 1000 asob. Hroznyja demanstracyi paūtarajucca dalej.

Padčas hetych zawarušeńniaū dasiulešni francuski ūrad padaūsia ū adstaūku. Nowy ūrad zarhanizawaū premjer uradu Deladier.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Z Sojmawaj biudžetnaj kamisii dawiedwajemsia, što ū Polščy z niedastatku srodkaū i škoł nia wučycca 458 tysiač dziaciej i dawoli šyroka raźwity sport moładzi.—Daūhu Polšča maje 4,448 577,390 zł Na kožnuju haławu prypadaje 134,8 zł.

Nowyja wybary ū Sojm. Hazety publikujuć čutki, što nowyja wybary ū Sojm adbuducca ū sioletniuju wosień.

Razwał u kamunistyčnaj partyi Polščy. Čaść siabroū hetaj nielehalnaj u Polščy partyi wysłała zajawu ū centralu Polskaj Partyi Socyjalistyčnaj (PPS), što wyrakajucca kamunizmu i pierachodziać u PPS. Hazeta „Rabotnik“ drukuje hetyja zajawy biaz podpisaū.

Tannyja siarniki. Hazety padajuć, što chutka pačnuć pradawać nowyja sierniki, horšyja, ale taniejšyja, pa 6 hrošaū za skrynačku.

Dziaržaūny niedabor. U śniežni 1933 h. dziaržaūny skarb mieū raschodaū na 19 miljonaū zł. bolš, jak dachodaū. Takim čynam užo nabrałasia ū hetym biudžetnym hodzie 193 miljony zł. deficytu.

Pawyšeńnie prezydenskaj emerytury. Urad padaū Sojmu prajekt, kab pawysić prezydenskuju emeryturu ad 1 tys. zł. da 3 tys. zł. u miesiac.

Z ZAHRANICY.

Strašnaje ziemlatrasieńnie ū Indyi. U paławinie sioletniaha studnia Indyju (Azija) nawiaściła strašnaje ziemlatrasieńnie. Padčas ziemlatrasieńnia zabita bolš 4000 asob, a raniena kala 10 tysiač asob. Darohi bityja i čyhunki zrujnawanyja, ziamla hłyboka paščapałasia. Škody wahromnyja, budyniny parazwaliwany, masty na rekach pałamany.

Padzieł Sawieckaj Ukrainy. Maskoūskija ūłady S.S.R.R. pastanawili stalicu Saw. Ukrainy z Charkawa pieranieści ū Kijeū. Hetyja pieranosiny majuć adbycca ū siol. wosień, i jany źjaūlajucca padziełam Saw. Ukrainy na dźwie čaści: na ziemlarobskuju, z stalicaj u Kijewie, i pramysłowuju, z stalicaj u Charkawie. Hetak dzielać maskali čužyja ziemli, kab lahčej utrymać ich pry wialikaj Rasiei.

Francuskaje sialanstwa dasiul palityčna było biazdziejnym. Ciapier heta sialanstwa pačynaje cikawicca palitykaj i damahajecca naležnych ūpływaū na dziaržaūnuju palityku. Dziela hetaha paūstaje ū Francyi i nowaje pytańnie — sialanskaje.

U Japonii padaūsia ū adstaūku ministr wajny Araki, jaki ūważaje, što wajnu Japonii z S.S.R.R. treba pačać, pakul apošni nia susim azbrojeny.

Miljon nowych haspadarak u Niamieččynie. Hitleraūski ūrad kala polskaj hranicy tworyć miljon nowych ziemlarobskich haspadarak na abšarach dasiulešnich dwaroū i faliwarkaū.

Z KRAJU.

Sprawa majemaści prawasłaūnych cerkwaū. Hady dwa tamu katalickija duchoūnyja ūłady Pinskaj i Wilenskaj dyecezyjaū padali ū sud carkoūnyja ūłady, žadajučy addańnia kaściełnym uładam 69 abjektaū naležačych da praw. cerkwaū. Katalickija duch. ułady swaje damahańni apirajuć na tym, što hetyja abjekty kaliś naležali da unijataū Najwyšejšy Sud hetyja žadańni biskupstwaū addaliū i wyjaśniū, što heta sprawa moža być wyrašanaj tolki wydańniem specyjalnaha zakonu. Takim čynam hety niepatrebny spor prypynieny.

Piśmy z wioski.

Biełarusy polonizujucca, ale nie saūsim.

w. Ruščany, Biełastockaha paw. Usiakaha čaławieka pawiarnuć možna i tak i hetak. I z našaha biełarusa zrabić možna čaławieka haračaha, abo zimnoha. A časta bywaje i tak, što ludzi nabirajuć adwahi biełarusaū susim pierarablać u palakoū Takaja pierarobka ludziej u našych časoch jość wielmi ū modzie. Na hetyja sprawy niaraz kładucca wialikija hrošy i tracicca mnoha ludzkoj enerhii. Nad biełarusami ūściaž i ciapier pracujuć, kab ich pierarablać. U nas škoła i kaścioł na pieršym miescy robiać hetu rabotu. My biełarusy nia majem biełaruskich škoł. My biełarusy taksama nia čujem swajej mowy ani ū kaściele, ani ū carkwie.

Ale što doūha nam hawaryć ab hetym, kali našy maleńkija sołtysy i to ūžo pierastajuć hawaryć pabiełarusku!

A woś prykład polonizacyi biełarusaū. U Biełastoččynie nad Narwaj, adna za druhoj razłažylisia čatyry biełaruskija wioski. Jany ūsie katalickija, jak ciapier, tak byli i daūniej. Polski kaścioł na henyja wioski pałažyū swoj śled.

Siahońnia prajedź chto praz henyja čatyry wioski, dyk pačuješ tolki, jak usie małodšyja tonieńka ščabiečać papolsku. A zapytacca tolki kaho, choć i starejšaha, ci biełarus jon, dyk adkaz budzie: „Ja nie biełarus, bo ja chadžu ū kaścioł“.

A tymčasam abapał henych čatyroch wiosak spolonizawanych lažać čatyry druhija wioski, čysta biełaruskija. Hetyja ūžo wioski zachawali najčyściejšy swoj nacyjanalny charaktar, bo daūniej jany byli unijackimi, a paśla astalisia prawasłaūnymi. I hetak da ich polonizacyja tak hłybaka nie pranikła.

Biełaruskaja maci tady najlepš baronie swaju siamju ad polonizacyi, kali nad kałyskaj swajmu dziciaci piajeć biełaruskija pieśni, a biełaruski baćka — tady, kali ū swajej chacie trymaje stała dobruju biełaruskuju hazetu.

D—a.

Naša žyćcio i naš Kaziuk.

Žodziški, Wialejskaha paw. Chacia ū „Biel. Krynicy wielmi redka spatkaješ ciapier karespandencyju ab Žodziškach, adnak heta nie dawodzić jašče taho, što tut žyćcio biełaruskaje zamiarło. Žyćcio biełaruskaje raźwiwajecca, a ideja adradžeńnia biełaruskaha narodu pahłyblajecca. Bo ci-ž možna padumać, što Žodziški zasnuli? I heta mieła-b stacca z tymi, tak słaūnymi kaliś, Žodziškami, dzie pyłaū ahoń lubowi Baćkaūščyny, dzie narod paznaū sam siabie i znajšoū swoj praūdziwy woblik? Chto tak dumaū by, wielmi mylaūsia-b. Bo choć ks. Dronič hwałtam wykinuū z kaścioła i ambony biełaruskaje słowa, i choć nie adnaho nas haniali pa turmach (Jarmak M., Hryb St. i inš), adnak z „Biełarusiaj“ nia skončyłasia ū nas, jak heta mieli zwyčaj kazać worahi biełaruskaj sprawy. Heta nia stałasia i nia staniecca. Tyja ludzi, što stali ćwiorda na biełaruskim hruncie zaraz paśla wajny, i ciapier stajać jašče bolš uzmacniūšysia ū swajej idei, a da ich dałučajecca moładź budučynia našaha narodu. Praśled biełaruskaje mowy i biełaruskich baraćbitoū zbudziū jašče bolšuju siarod nas luboū da swajej mowy. Jašče časta my čujem z ambony słaūco ksiandza, katory biełaruskaść raūnuje z kamunizmam, kažučy, što ūsiudy jość kamunisty, u kožnaj parafii ich znajdzieš, ale ū Žodziškach ich „niama“, bo kamunisty na krylisia słowam biełarusy. Prykra robicca, kali ksiondz miašaje takija roznyja paniaćci i haworyć tak da wiernych. Heta jość latańnie ū pawietry biez apory na faktach, na dowadach, dy chto-ž moža hetamu pawieryć? U kaściele jość najbolš šerych świtak mužyckich. A hetyja šeryja świtki — heta mužyki, sialanie — biełarusy, katoryja naležać da kaścioła i spaūniajuć swaje chryścijanskija abawiazki. Dyk jak tady možna hawaryć, što biełarusy—heta kamunisty, kali tut wychodzić inačaj. Ale wiedajem dobra i heta, što worahi biełaruskaha narodu čaścieńka ūžywajuć hetaha kańka i dla swaich metaū nazywajuć kožnaha biełarusa kamunistam. Praūda, jość i ū nas kamunisty, ale ci Łodź, Waršawa ich nia maje? Dyk pa što tady biełaruski ruch klajmić kamunizmam?

Da niadaūnaha času hurtok B. I. H. i K. ū Žodziškach byū centram, kala katoraha hramadzilisia ūsie bolš świedamyja adzinki tutejšaha žycharstwa. Była zhodnaść pamiž siabrami jak najbolšaja, usich łučyła wialikaja ideja nacyjanalnaha i socyjalnaha adradžeńnia biełaruskaha narodu. Praca šparka jšła napierad.

Ale woś znajšlisia i takija ludzi, katorym nie da ūspadoby staū B.I H. i K., katorym „ciesna“ było pracawać u im dla dabra biełaruskaha narodu, i jany pastanawili załažyć nowuju arhanizacyju T. B Š. Pačynalnikam takoj „raboty“ byū i jość Kaziuk Čartowič. Čamu jon nia lubie B.I.H.iK., usie my nadta dobra wiedajem.

U nas narod užo, dziakawać Bohu, nia jość ciomnym i jaho tak lohka nie ašukaješ. Wiedaje, što z saboj niasie Kaziuk i jakim „duškom“ ad jaho wieić. Z pamiž starych baraćbitoū za biełaruskuju sprawu nichto za im nia jdzie. Narod naš užo dobra wiedaje, što ludzi, zhurtawanyja ū Wilni kala „Род. Краю“ i kala „Бел. Газ.“—heta škodniki, adpadki biełaruskaha narodu, katoryja paświacilisia na słužbu našym woraham.

U toj momant, kali patrebnaja jość dla nas jednaść, kali treba zhodna prociūstawicca našym škodnikam i woraham, Kaziuk raźbiwać pačaū henuju jednaść i dzialić ludziej na hrupy. Jon ulez u B.I.H.iK., kab zrabić tam razwał, kab raźbić hetuju arhanizacyju i pažywicca mazalom i hrašmi B.I.H.iK.

Kudy-ž tam, razyšoūsia naš — durnawaty Kaziuk, jak jaho mnohija nazywajuć, — što i ū Sačyniatach i ū Niachwiedach dumaje ab załažeńni T.B.Š. i heta tady, kali ū T.B.Š poūny razwał, kali ū arhanizacyju hetu nachalna lezuć kamunisty. Dy ci-ž nie chwataje nam swajej arhanizacyi, jakoj źjaūlajecca B.I.H iK. Dyk wiedaj ža, Kaziučok, što ty nam čužy, choć wyšaū z pad sialanskaje strachi, i za taboj nia pojdziem.

Taksama nia tknisia da nas i z „Бел. Газэтай“, bo hetaja hazeta čužaja dla nas. Dla ciabie mo‘ jana i dobraja, ale nie dla nas. My sawieckimi nawinkami nia cikawimsia, pryjelisia jany nam. Što z taho, što tam budujucca nowyja mašyny, kali narod wymiraje z hoładu. Dla nas chwacić swajej hazety, jakoj jość „Bieł. Kr.“ Jana adkazwaje našym duchowym wymahańniam i heta mieli my mahčymaść dobra paznać.

Arhanizujecca ū Žodziškach kooperatywa, u jakoj Kaziuk takža mačaje swaje ruki. Kooperatywa—reč dobraja i na časie i biazumoūna musili-b świedamiejšyja ludzi dapamahčy u hetym. Byli ūžo i schody arhanizacyjnyja Uwajšli ū urad kooperatywy i ludzi świedamyja, katoryja pakazali siabie na nacyjanalnaj biełaruskaj niwie. Jość nadzieja, što palityki tut Kaziuku pawiaści nia ūdasna, ale fakt zastajecca faktam, što siabroū kooperatywa mieła-b šmat bolš, jak maje, ale niekatoryja nie dałučylisia siudy, bo paprostu nie dawiarajuć Kaziuku.

I jašče adno. Kali Kaziuk choča, kab za im išoū narod, to pierš treba

Tyfus i syfilis (prancy). U pawietach Dzisienskim i Brasłaūskim, dzie narod stała niedajadaje z pryčyny letašniaha nieūradžaju, pačaū šyrycca tyfus. U Brasłaūskim paw. užo nie ad minułaha hodu raźjadaje ludzkija arhanizmy tamašnich starawieraū syfilis. Starawiery prybyli siudy sotni hadoū tamu z Pskoūščyny i, mahčyma, što pryniosšy z saboj hetu chwarobu, nia mohuć jaje pazbycca.

jamu stacca čaławiekam, a ŭ jaho z hetym nia ŭsio ŭparadku.

Z usiaho wyšej skazanaha, jasna widać, da čaho imkniecca Kaziuk i čamu jon prabuje raźbić B.I.H iK. Škodnikaŭ musim ad siabie adłučać i pad nijakim widam nia ŭpuskać ich ani ŭ urad B.I.H.iK., ani pazwalać, kab koštam B.I.H iK. żywilisia! Cešć chaj budzie tym, što patrapili prociŭstawicca škodnaj rabocie niedapiečanaha Kaziuka i wytrywali na daŭniej zaniatych linijach!

Siabra.

Niedarod i wyzysk.

Hłybokaje, Dzisienskaha paw. Z apošnich piaci hadoŭ sioletni hod badaj najciažejšy. Uradžaj letašni byŭ pusty; bulba nie wiarnuła nawat nasieńnia, żyta dało 3 procanty, awios tolki dwa procanty, a sienažaci tak i astalisia nia košany, bo byli zality wadoj. Ciapier niama chleba, niama pošaru, niama i hrašej na padatki. Sialanie pradajuć apošnija manatki, kab ratawacca załatoŭkaj ad sekwestratarskich licytacyjaŭ, jakija pradajuć jašče taniej, jak na rynku. Mnoha jošć haspadarak, što nia majuć kania, bo pradadzieny na chleb. Heta ciapier, a što budzie wiasnoj, kali treba jści ŭ pole z sachoj. Ab hetym sialanie bajacca nawat i dumać, bo sapraŭdy moža stacca toje, što z Wałyncam u balšawickaj turmie „Amerykancy."

Macniejšyja haspadarki jašče siak-tak trymajucca, ale i tudy zahladaje hoład. Ad hoładu ludzi baroniacca rozna. Adny pradajuć wopratku i pałatno, a druhija skacinu. Najhorš u siemjach na słabych haspadarkach; haładujučy ciapier nieachwotna čakajuć wiasny i biazradna zdajucca pad apieku losu,—što budzie, toje budzie.

U hetaj biadzie, dzie zdajecca moža mieć miejsca tolki achwiarnaja pomač, hłyboka zahniaździŭšysia šyrycca wyzysk. Handal uwieś u rukach prywatnych i sielanin swaje astatki pradaje pa canie strašenna niskaj. Kali-ž prychodziecca kuplać sielaninu, dyk tam ceny ćwiordyja i sialanstwu niedastupnyja. Apračа hetaha, kali treba sielaninu swoj tawar adważyć i za jaho atrymać hrošy, dyk i tut jamu „sprawiadliwaść" mačychaj; waha „sapsujecca" i lahčejšym tawar ważyć, a na hrošy ad kupca treba čakać tak doŭha, až pakul źlitujecca i zapłacić, kolki zachoča. Na hetkija sprawy našy sialanie zwaročwali ŭžo ŭwahu miajscowaj palicyi, ale jana, jak pačnie pa formie wiaści śledztwa, dyk tak doŭha sprawa ciahniecca, što až świedki zabuducca, što bačyli ŭ sapraŭdnaści.

Heta ŭsio pakazwaje nam, što musim arhanizawacca, kab swaja arhanizacyja achapiła našu wytworčaść, naš zbyt tawaraŭ i našu spażywieckaść. Słowam, treba takoj arhanizacyi, kab achapiła ŭsio našaje ekanamična haspadarčaje hramadzkaje żyćcio. Treba šyrokaj kooperacyi.

A. S.

Wybary, pratesty i pierawybary.

Šumsk, kala Wilni. Apošnimi časami našy sialanie haworać tolki ab wybarach. Ale i jošć ab čym hawaryć. Prajšli wybary ŭ hramadzkija rady, —byli niezdawoleny sialanie i padawali pratesty. Adbylisia wybary ŭ hminnuju radu—niezdawoleny panki i paŭpanki. A čamu, dyk woś pasłuchajcie Nawučanyja horam sialanie ŭ hminnuju radu nie prawiali ani adnaho panka ani paŭpanka. A ŭdałosia sialanam heta tamu, što kiraŭnikom hetych wybaraŭ byŭ sprawiadliwy čaławiek i pastupiŭ pa zakonu. Panki z swaimi prysłužnikami padali suproć hetych wybaraŭ pratest i zdajecca naznačany ŭžo pierawybary. Adnak našy sialanskija pradstaŭniki— wybarščyki paddacca nia dumajuć i spadziajucca, što pry stojkaści sprawiadliwaść pieramoža.

Šumščak

Беларускі спэктакль.

Новы Сьвержань, Стаўпэцкага павету. У нядзолю 7.I.1934 г. адбыўся ў нас спэктакль-вечарына, ладжаны беларускаю моладзьдзю з гэтага-ж самага мястэчка. Пастаўлена была камэдыя Ф. Аляхновіча п. н. „Шчасьлівы Муж".

Паміма байкоту з боку нашых дамарослых „палякоў" і ўсяе сьвержанскае „арыстакрацыі" (гміннае, паштовае і. г. д.), абшырная саля Пажарнае Дружыны не магла ўмясьціць усіх прыбыўшых з вакалічных вёсак і суседніх Стоўпцаў Беларусаў, каб убачыць і пачуць са сцэны ў роднай, матчынай мове граную п'есу. Часта ладзяцца ў нас вечарыны, спэктаклі, ведама польскія, праз слаўных па асёй Зах. Беларусі „стшэльцув" з места Стоўпцаў (у Сьвержані яны пакуль што не загнезьдзіліся)—праз сьвержанскіх „рэзэрвістаў"... ды яшчэ праз іншыя нейкія „колы" і „кулэчкі".

Прадстаўленьні гэтыя аднак цешацца страшэнна слабай прыхільнасьцяй і на нашым, сьвержанскім грунце не прышчапляюцца. Зьявіцца бывала на гэткае „rezerwistowskie" прадстаўленьне апрача артыстаў і паліцыянта — 9 (дзевяць!!) асоб, пагутараць між сабою аб тым, што „хамство" цёмнае не цікавіцца іх „культурна-асьветнай" працай ды на гэтым усё і канчаецца.

Ня ўходзячы бліжэй у ацэнку ігры паасобных артыстаў-аматараў, трэба зазначыць, што п'еса адыграна добра і што глядзельнікі былі больш чым задаволены. Агулам спэктакль, як з боку матэр'яльнага, так і з моральнага, вельмі ўдаўся і астаецца толькі пажадаць на будучыню, каб сьвержане маючы на ўвазе ўзгадаваўчую мэту свайго маладога пакаленьня, часьцей ладзілі гэткія спэктакль-вечарыны і не задавальняліся толькі адным спэктаклем і скокамі, а давалі апрача гэтага на сцэну родныя песьні і дэклямацыі прыгожых вершаў сваіх пісьменьнікаў. Сіл, як мне ведама, павінна хапіць, — крыху часу і добрае волі і ўсё можна будзе зрабіць.

Спадзяюся, што „Шчасьлівы Муж" быў пачаткам аднаўленьня працы ў гэтай галіне і што за гэтай камэдыяй пойдуць іншыя, паважнейшыя і больш карысьнейшыя рэчы.

Сьвержанец.

Аб нашай старонцы пару слоў.

Перабродзе, Браслаўскага пав. Прыгожая наша мястэчка Перабродзе. Кругом возера, а пасярод сяло з прыгожай царквой. Народ наш кругом беларускі, каталікі і праваслаўныя гавораць пабеларуску і ўважаюць сябе беларусамі. Цяжка цяпер жыць нашаму народу; зямлі мала, сем'і вялікія, зарабіць няма дзе, а жыць трэба і кажуць падаткі плаціць. Выкручваецца наш народ яшчэ неяк з гэтай бяды, але надта-ж цяжка. Людзі ўсё чакаюць палёгкі, але адкуль яна прыдзе, — ніхто ня ведае. Малодшыя раяць ні накога не спадзявацца і ні адкуль ласкі не чакаць, а трэба толькі мерыць свае сілы, каб перамагчы бяду. І праўда, малодшыя ўсьведамляюцца, чытаюць кніжкі і газэты, кажуць, што трэба, каб і ў царкве сьвяшчэньнік гаварыў да народу панашаму — пабеларуску, дык будуць гэтак гаварыць і ў гміне і ў іншых мясцох; а тады і нам мужыком будзе добра.

Старэйшыя прыслухоўваюцца да гэтага і таксама кажуць, што трэба рабіць, каб было інакш і лепш, бо цяпер надта дрэнна. Дык вось, як жывуць і аб чым гавораць нашы людзі. Крыху замала прыходзіць да нас беларускіх газэт. Трэба будзе старацца, каб прыходзіла больш. Кожны сьведамы беларус павінен падбаць, каб у кожнай нашай вёсцы была наша беларуская газэта „Бел. Крыніца" і каб кожны селянін яе чытаў. Прасьвячайма свае галовы, а як станем сьвятлейшымі, дык гора прагонім і бяда ад нас уцячэ.

Перабродзкі.

Z Wilni.

Zabojstwy i samahubstwa. 29.I. s. h. skarbowy ŭradawiec Šablinski zastreliŭ swaju żonku 35 h., dačku 15 h. i sam paśla hetaha zastreliŭsia. Pryčyny hetaj trahedyi da publičnaha wiedama nie padany. Hazety dahadwajucca, što pryčynaj źjaŭlajecca materjalny niedastatak, bo Šablinski byccam byŭ zwolnieny z pasady.—Dzion dwa prad hetym bandyty zamardawali a staŭnoha hienerała Rymkiewiča.

Zastoj u ramieśnikaŭ. Ciažkoje materjalnaje życcio mocna adciskaje swaju piačać i na ramieśniki, ciapier bolš 1000 ramieśnikaŭ u Wilni biaz pracy.

Pratesty weksaloŭ. U m-cy śniežni 1933 h. u Wilni i Wilenščynie zapratestawana weksaloŭ na 1 miljon 175,768 zł. 90 hr.

V-ty Tradycyjny Kancert-Bal 3-ch studenskich sajuzaŭ: Biełaruskaha, Litoŭskaha i Ukrainskaha adbudziecca 10 lutaha s. h. u zali Litoŭskaj Himnazii im. Witaŭta Wialikaha. Dachod praznačany dla niezamožnych studentaŭ.

Paštowaja skrynka.

Janka Makar. Dziakujem, skarystajem, pišycie čaściej. Pažadana, kab Wy apisali nastroi Wašych wakolic. Čakajem.

Rusak. Wielmi dobra, što našu hazetu pašyrajecie siarod sialan. Jana tolki ŭ sieło i praznačana, miaščanam maskalom abo palakom—peŭnie-ž nia budzie padabacca. Dyk puščajcie ŭ sieło „B. Krynicu" i nie zatrymoŭwajcie jaje ani na dzień u mieście.

Biedys. Wiestki nami padany ab aryštach u BSSR uziaty z kamunistyčnaj presy. Ab hetych aryštach paćwiardziła i „Бел. Газэта," a jana-ž chiba painfarmawana dobra. Hazetu Wam pasyłajem.

Harusu. Z prysłanaha skarystajem, nacyjanalizm hoły biez kašuli wyšejšych idejaŭ u kancy zastydajecca i sam siabie, dyk treba jaho ŭbirać u wopratku i ahulna ludzkich idealaŭ. Wolnaść jošć tady sapraŭdnaj, kali jana nie spryčyniaje druhim śloz.

Strabski. Słušna ćwierdzicie što naša sialanstwa nie prajmajecca teoryjami ani kamunistyčnaj ani „hitleraŭskaj" z „Nowaha Šlachu," a jaho ciapierašni ŭzdym—heta niezdawaleńnie z sučasnaha pałažeńnia. Ab tym, što ŭ hetym uzdyjmie jošć niamała nacyjanalizmu, my taksama zaŭważwajem z pisiem. Dyk nakiroŭwajcie adpawiedna hetyja rečyščy, kab jany palilisia tudy, kudy treba, — u mora Biełaruś.

Ці Вы ўжо запісаны на Завочны Курс КООПЭРАЦЫІ пры рэд. „САМАПОМАЧЫ"?

Рассыланьне лекцыяў Завочнага Курсу Коопэрацыі ўжо пачалося. На Курсе праходзяцца такія прадметы: Навука аб коопэрацыі, Коопэратыўнае права, Арганізацыя і тэхніка прадажы, Таваразнаўства, Коопэратыўнае Кнігаводзтва і Беларуская мова. — Навучаньне на Курсе бясплатнае. Аплата сабекоштаў (папера, фарба, друк, пошта) на чалавека за цэлы Курс выносіць 20 зл. і ўпісныя 1 зл., разам **21** зл. Пры запісе абавязкава трэба заплаціць 5 зл., рэшта ў рассрочку.

Без надасланьня грашэй лекцыі нікому не высылаюцца.

Хто аплаціць згары цэлы Курс, той замест 21 зл. плаціць толькі **16** зл. Вучні плацяць 16 зл. у рассрочку.

Завочны Курс Коопэрацыі—гэта найвыгаднейшая магчымасьць дакладней пазнаць коопэрацыю нікуды не выяжджаючы, бо лекцыі прысылаюцца поштай кожнаму да хаты. Скарыстаць з гэтае рэдкае аказіі павінен кожны, а асабліва сябры Управаў і Наглядных Радаў.

Грошы на Курс пасылаць найлепш з кожнай пошты праз чэкавае конто П.К.О. № 180.485 (уласьнік інж. Ад. Клімовіч), а ўсякія пісьмы ў справах Курсу кіраваць на адрэс:

Рэдакцыя «САМАПОМАЧЫ»
Вільня, Полацкая 4—0.

Новы „выступ" п. А. Луцкевіча.

№ 2 сёл. г. „Роднага Краю", якога рэдактарам зьяўляецца п. А. Луцкевіч, у стацьці „Савецкі паход проціў беларусаў", прыносіць нямала сэнсацыяў.

Вось п. А. Л. „абураючыся" на Саветы за іх душэньне беларусаў, так разагнаўся, што Сталіна чамусьці абазваў Азэфам, імем ведамага правакатара. Тымчасам Сталін робіць тое, што рабіць яго вуча і змушае яго вера — камунізм. Каб п. А. Л. меў хоць якой-небудзь ідэовасьці столькі, колькі Сталін мае ідэовасьці камуністычнай, дык бы ня траціў энэргіі дзеля падпарадкаваньня беларускага народу польскай нацыянальнай і соцыяльнай палітыцы і не рабіў-бы гэтым крыўды беларускаму народу. Ды ўсе-ж добра памятаем, як п. А. Л. у свой час адносіўся да Саветаў, калі працаваў у Грамадзе і што ў ёй рабіў. Дзеля гэтага здаецца нам, што назова Азэфа хутчэй надаецца не Сталіну, а ягонаму крытыку. І агулам уважаем, што калі п. А. Л. выступае ў абароне нядаўна арыштаваных у Саветах беларусаў, якім—хоць на наш пагляд ня слушна, — прыпісваюць супрацоўніцтва з польскаю дэфэнзывай, дык робіць ім сапраўды мядзьведжую прыслугу, бо ж сяньня сам п. А. Л. ужо „працуе" на фронце полёнофільскім. Словам, чыя тут карова рыкала-б, а п. А. Л. маўчала-б!...

А вось яшчэ цікавейшае знаходзім у „Родным Краі". Саветы — чытаем там — за тым ня любяць п. А. Л., што ён быў ініцыятарам (нядаўна пісаў, што тварцом) акту абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі 25.III.1918. Тымчасам трэба ведаць, што калі ў Вільні, дзе стала прабываў п. А. Луцкевіч, у студзені месяцы 1918 г., Віленская Бел. Рада, у якой ён не апошнюю іграў роль, абвесьціла сваім палітычным ідэалам „Літоўска-Беларускае Гаспадарства" у межах даўнейшага Вялікага Княства Літоўскага, гэта знача: ідэал літоўска-беларускай фэдэрацыі, — даўно прад гэтым, бо ўжо ў 1917 г. у Менску, пачынаючы ад Усебеларускага Кангрэсу, на якім п. Луцкевіч ня быў, у некатоных беларускіх палітычных дзеячоў, (дзеля пэўных прычын называць іх тут ня можам) ужо лунала думка аб поўнай самастойнасьці Беларусі. І калі п. А. Л. прыбыў з Вільні ў Менск на паседжаньне Рады Рэспублікі, што абвесьціла незалежнасьць Беларусі ў 1918 г., дык аб пытаньні гэтай незалежнасьці ўжо вяліся там гарачыя спрэчкі і ішла гарачая барацьба незалежнікаў з староннікамі фэдэрацыі Беларусі з Расеяй.

Дык столькі праўды ў незалежніцкім ініцыятарстве п. А. Луцкевіча, скольк ў тым, што ён рабіў некалі рэвалюцыю проціў цара, калі быў прастрэлены ў... штаніну.

А вось такжа ня менш цікавы кавалак „pióra pana Antoniego" ў „Родным Краі". Камуністы—чытаем там — і за тое злыя на яго, што ён, як „культурнік" і тая група, што быццам „каля яго згуртавалася", (цікава, сколькі іх?), у свой час рашуча адмовілася падпарадкавацца камуністычнай партыі, бо, бачыце, ён заўсёды ўважаў, што „культурнай працы ня можна мяшаць з палітычнай". Тымчасам, як п. А. Луцкевіч падчас Грамады „аддзяляў" палітыку ад культуры, усе добра памятаем і ўсе бачылі так-жа, як ён гэта рабіў, калі з лагеру саветафільскага перакінуўся ў полёнофільскі, калі залажыў „культурную" установу „Цэнтрасаюз", упрогшы ў яго „Навук. Т-ва" і Гімназію і пашоў на выбары, каб разьбіваць беларуска-украінскі блёк.

Ну й штукар гэты пан Антоні! У сваім шкодным бяспрынцыпным палітыканстве і ў наіўным самахвальстве сапраўды ня мае граніц.

Л. М.

Redaktar: Jan Paźniak

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 3.

Wydawiec: A. Šutowič